№№186–187
(3316–3317)
26–29 лістапада 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

***Якуб КОЛАС***

**Да ўвагі!**
**Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

НА ЎЛАСНЫЯ ВОЧЫ

## Кандыдаты-невідзімкі

*Учора ў Мінску карэспандэнт "Народнай Волі" марна патрапіў тры гадзіны ў пошуках пікетаў кандыдатаў у прэзідэнты.*

Выбарчая кампанія ў Беларусі знаходзіцца на адным з самых важных этапаў — этапе агітацыі. І, здавалася б, кандыдаты, якія наперабой скардзяцца на тое, што ім выдзелена для выступлення перад выбаршчыкамі вельмі мала эфірнага часу, павінны запаланіць беларускую сталіцу і рэгіёны краіны сваімі пікетамі.

Учора вырашыў паназіраць, як агітуюць за кандыдатаў у прэзідэнты ў сталіцы.

10 раніцы. Выхад з метро "Акадэмія навук". Пікет у падтрымку Уладзіміра Някляева. Пад сцягам грамадзянскай кампаніі "Гавары праўду!" за Уладзіміра Пракопавіча агітуе малады чалавек Юрый. "З самага ранку тут стаю, — гаворыць ён. — Месца хоць і люднае, але не вельмі зручнае для размоў з людзьмі — хто на працу спяшаецца, хто на вучобу. Але бывае, што людзі самі падыходзяць, цікавяцца. Расказваю ім пра Някляева".

Пагутарыўшы з карэспандэнтам "Народнай Волі", Юрый працягнуў агітаваць мінчан. Раздаваліся візітоўкі з кантактным тэлефонам штаба Някляева, улёткі, на якіх былі пазначаны дата і час выступлення кандыдата ў эфіры беларускага тэлебачання і радыё.

Паназіраўшы за працай Юрыя хвілін дваццаць, раблю выснову: у большасці людзі ахвотна бяруць інфармацыйныя матэрыялы. Але сустракаюцца і такія, якія шарахаюцца ад хлопца, як чорт ад ладану.

Дарэчы, усім, каму Юрый раздаваў інфармацыйныя матэрыялы, на развітанне ён казаў адну і тую ж фразу: "Прыходзьце на выбары толькі 19 снежня".

Ад Акадэміі навук я адправіўся ў мікраераён "Усход". Тут напярэдадні, у сераду, былі заўважаны пікетчыкі з каманды Аляксандра Лукашэнкі. Вельмі хацелася пагутарыць з імі. У прыватнасці, цікавіла пытанне, ці збіраецца іх кандыдат вяртаць адабраныя ў студэнтаў, інвалідаў, чарнобыльцаў і воінаў-"афганцаў" ільготы. Але адказу пачуць так і не давялося: у раёне Нацыянальнай бібліятэкі ў чацвер з раніцы не было пікетаў не толькі ў падтрымку Лукашэнкі, але і ў падтрымку іншых дзевяці кандыдатаў...

Прайшоўшы ад Нацыянальнай бібліятэкі да аўтавакзала "Маскоўскі", я вырашыў сесці ў аўтобус №100. Ён едзе па праспекце Незалежнасці — самым, здавалася б, зручным месцы для агітацыі людзей. І я рассудзіў: як убачу пікеты іншых кандыдатаў — выйду з аўтобуса і...

Але...

З вокнаў аўтобуса ўбачыў яшчэ два пікеты ў падтрымку ўсё таго ж Някляева — каля станцыі метро "Парк Чалюскінцаў" і каля выхаду з метро "Плошча Перамогі".

Чаму няма іншых?!

Вярнуўся на плошчу Якуба Коласа: менавіта тут падчас збору подпісаў было найбольш пікетаў прэтэндэнтаў. А ўчора ў 11.20 — ніводнага! Падумаў: так і з працы можна вылецець, звязаўшыся з гэтымі палітыкамі. Ну як патлумачыць галоўнаму рэдактару, чаму не выканаў заданне? Ну хто паверыць, што магчымасць пагутарыць з пенсіянерамі, якія і ў снег, і ў дождж ідуць на "Камароўку" па гародніну, не выкарыстаў ніводны з кандыдатаў?

Тая самая карціна была і ля ГУМа. У 12 гадзін сюды толькі-толькі падышлі людзі з каманды Андрэя Саннікава... Я кінуўся да іх, як да родных. Але яны яшчэ ўладкоўваліся на месцы, таму пагутарыць не атрымалася. Калі такая несуцяшальная карціна назіраецца ў Мінску, то што ўжо казаць пра рэгіёны, вёскі і мястэчкі? Глуха, глуха, глуха...

На гэтым фоне дзіўным выглядаюць заявы некаторых кандыдатаў пра тое, што 20 снежня Беларусь будзе мець іншага прэзідэнта. Бо, калі і сапраўды ў кандыдатаў ёсць жаданне змяніць уладу, яны павінны дзень і ноч агітаваць за сябе...

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

АКТУАЛИИ

*Светлана КАЛИНКИНА*



## Позор в прямом эфире

Вот претенденты на должность президента и получили прямой эфир. Долго они плакались, что не имеют доступа на телевидение и радио, а потому не знают их люди. Много они жаловались, что мало времени выделяется на предвыборную агитацию в электронных СМИ. Цензуры боялись, как нечистая сила — креста. Но вот получили все, чего желали. А результат таков, что временами хочется выключить телевизор.

Поле выступления предпринимателя **Дмитрия Усса** в интернете тут же появились недоуменные комментарии в том смысле, что, мол, не был ли претендент на президентский пост пьян? Если бы кандидат выступал “под мухой”, то это было бы понятным объяснением того, что произошло, но, конечно, пьян Усс не был. Что еще более позорно, так это то, как, будучи в здравом уме и твердой памяти, он только и смог, что начитать по бумажке шесть минут обрывочных тезисов и при этом сражался со словом "агроперерабатывающий". Длинное оно для него, непроизносимое. Да Усс и над словом "демократический" попотел.

Тем не менее человек идет в президенты. И ему не стыдно, он считает себя вменяемым и адекватным. Он искренне мнит себя подходящей кандидатурой.

Насколько дискредитирован Александром Лукашенко пост президента, если и жук, и жаба, и санитарка, и безработный, и предприниматель, которому просто абсолютно нечего сказать людям, считают себя достойными этого поста — отдельная большая тема. Но этот белорусский феномен, когда ткни пальцем — и попадешь в "будущего президента", — явление глубоко нездоровое.

Вот **Михалевич**. Учился Алексей много, человек он в политике опытный, с хорошими связями за рубежом, слова типа "нефтеперерабатывающий" выговорил без запинки, но главного не понял даже о самом себе. Не в моих правилах переходить на больные и личностные темы, но в данном случае от этого правила я отойду. Потому что Михалевич сознательно идет в большую политику, причем целенаправленно замахивается все выше и выше. А тут уже другие правила и другие требования.

Ораторское искусство для любого политика — курс обязательный. Потому что сколько бы мы ни умничали, сколько бы ни возмущались, но политика любят за речи. И если у тебя дефект речи, то либо долго и упорно работай с логопедом, чтобы дефект если не исправить, то скрыть, либо забудь про то, что ты можешь стать публичным человеком, трибуном. Просто забудь! Безголосые не выходят петь, заики не становятся рассказчиками, тугоухие не музицируют... Это логично, таковы правила. Полчаса слушать, как Михалевич шепелявит, — это вы меня извините... Это — как если бы я мучила публику оперным пением.

Энергетики — ноль, четкости мыслей — нет, что главное, а что второстепенное в выступлении — непонятно, эмоции — отсутствуют... Просто классический пример того, как нельзя делать, как нельзя выступать. Михалевич говорит про команду, но из выступления понятно, что нет там команды, нет людей, которые могут сказать: "Алесь, одумайся, не позорься". И о чем он говорил? Обошел все острые углы, внятно не высказался ни по одной серьезной проблеме. Просто невозможно было поверить, что перед нами сидит некогда один из руководителей Партии БНФ. Кто его так перевоспитал? С помощью каких кнутов или пряников?

А вот Санников мне понравился. Рымашевский отлично дебютировал перед большой аудиторией. Он мне понравился даже больше, чем опытный трибун Статкевич, эмоциональная речь которого часто была построена на намеках. Рымашевский открывал предвыборные выступления, ему было сложнее всех, но говорил по делу, без зауми, о многом, с болью. В меру цифр, в меру лозунгов. Думаю, он будет еще более интересен и во втором выступлении, и в дебатах. Искренне рада за Виталия.

Нельзя не отметить, что в выступлениях Санникова, Рымашевского, Статкевича и цензорам было над чем поработать, если бы не прямой эфир. Что в наших условиях тотального страха немаловажно.

По крайней мере, для меня очевидно, что власти свои рычаги влияния на оппозицию задействовали. Поскольку они теперь старательно изображают небывалую демократию и предоставили кандидатам свободу эфира, то одновременно для нейтрализации эффекта начали активную "разъяснительную работу" с претендентами. "Умные" эксперты на полном серьезе говорят кандидатам, что нельзя пугать избирателя, что надо быть респектабельным и умеренным, что Лукашенко в болтологии не перешибешь — потому делай акцент на цифры, на глубину и профессионализм. Что ни в коем случае нельзя показаться радикальным, излишне резким, что не надо пугать номенклатуру, не надо раздражать главного оппонента, не надо поднимать больных для него тем...

Посмотрим, кто купится на эти речи. Но в моем понимании законы эффективной политики требуют обратного: надо поднимать те темы, которые волнуют народ. Причем тем языком, которым люди говорят между собой на кухнях.

А народ сегодня не процентами ВВП апеллирует. Лукашенко многим людям уже просто надоел. Уже даже тупые понимают, что немалая часть чиновников — это ворье, что не живут они на свою зарплату. Что про себя они думают, стараются обеспечить безбедное существование и себе, и внукам. А нам с умным видом рекомендуют затянуть пояса, затыкают рот мизерной пенсией и смешным заработком. Да еще просят благодарить, что дали эти крохи вовремя.

Вот об этом и надо говорить. Не можешь сам — возьми за руку вменяемую и разговорчивую бабушку-пенсионерку, посади рядом с собой в студии и расспроси с пристрастием, как она, отработав 30—40 лет дояркой в колхозе, живет сегодня на 300—400 тысяч. И почему носит одежду, купленную еще "за савецкім часам", почему ее в больницу не взяли, когда думали, что помирает... Народ плакать будет от этого рассказа. Потому что многие узнают себя, ведь многие именно так и живут в нашей "прекрасной стране".

Полумертвых не спасают, а выписывают из больницы, чтобы не портили статистику смертности. Денег на пенсию инвалидам так жалко, что безногих гоняют каждый год на ВТЭК, будто ноги могли какимто чудом по новой вырасти. Да и какие эти пенсии? Инвалиды детства первой и второй групп, которые обижены судьбой, которые просто не могут работать, получают стыдные гроши — чуть больше 200 тысяч рублей (!). У Лукашенко на столе, образно говоря, даже карандаши дороже стоят.

И это государство для народа, это социальная защита населения, которой он хвалится?..

Молодые и здоровые дети тянут последние деньги из стариков, потому что не могут на свои зарплаты не то что квартиру — сапоги приличные купить раз в несколько сезонов. Если ребенок пошел учиться — голодает семья, ведь образование в подавляющем большинстве платное. Если человек не дай Бог серьезно заболел — проси скорой смерти, потому что хорошие лекарства будешь только разглядывать в аптеке, купить их денег не хватит.

И это пресловутые высокие доходы?..

Спилили лес, тупо сожгли — и вот вам показатели роста ВВП. Это наше пресловутое экономическое чудо?..

Зубами те, кто при кормушке, будут за эту кормушку держаться. Грудью лягут. Голос сорвут в крике, что нет президента лучше, чем Александр Григорьевич Лукашенко. Потому что они-то при нем хорошо живут, это их президент. Их — тех, кто из слуг народа превратился в царьков с безмерными полномочиями и с безмерными аппетитами. Они будут запугивать и обманывать, будут чернить всех, кто Лукашенко критикует, будут обещать золотые горы и задабривать предвыборным повышением пенсий и зарплат. Но каждый из кандидатов оппозиции должен бы объяснять, что именно на Лукашенко лежит вина за эту систему, что это он ее создал и что это он ее покрывает. Покрывает даже тогда, когда совершаются страшные преступления.

Он часто говорит о детях, о том, как их любит. Но именно он тратит деньги на развлечения типа президентских хоккейных турниров в то время, когда отчаявшиеся матери просят помочь в сборе средств на лечение их умирающих детей. Помочь кто чем может, потому что у государства на прием для престарелых хоккейных звезд деньги есть, а на оплату лечения детей — нет. Как это называется?

Как назвать человека, который одной рукой подписывает закон об отмене льгот для детей, стариков, чернобыльцев, студентов, а другой — программу развития хоккейного спорта, предусматривающую строительство 52 (!) ледовых дворцов?! Оказывается, 26 имеющихся дворцов, с большинством из которых и так никто не знает, что делать, нам мало. И ведь все понимают, что это откровенное самодурство. Что такое просто немыслимо ни в какой другой европейской стране — держать стариков в нищете, без дорогих и льготных лекарств, экономить на детских пособиях, на бесплатных санаторных путевках, но десятками строить ледовые дворцы!

Лукашенко давно не народный президент. Люди со всей страны едут в президентскую резиденцию со своими бедами, хотят записаться к нему на прием, а им шестнадцать лет говорят: "Невозможно, президент простых граждан не принимает". Я не знаю ни одного адреса, по которому он приехал без предупреждения местной вертикали, ни одного случая, чтобы он отклонился от предварительно оговоренного маршрута, захотел увидеть, а что там, в стороне от подготовленной к его приезду трассы... Он окружил себя такой охраной, которой не было у всех секретарей ЦК КПБ вместе взятых. Для чего? А чтобы не видеть этого народа и даже не знать его проблем. Другого ответа просто нет...

Если не стараться быть респектабельным и называть вещи своими именами, то тут не полчаса — тут можно говорить часами. Потому что наболело, потому что достало, потому что просто стыдно столько лет терпеть этот кураж питекантропов у власти. Людям надо объяснить одно: хватит терпеть это издевательство, потому что дальше будет только хуже. Власть становится все наглее, ее аппетиты растут, бесстыдство переходит все границы. И мы просто обязаны сказать этому беспределу: "Хватит!" Белорусы не дурнее всех, потому имеют право сами выбрать себе власть. И белорусы не трусливее всех, чтобы отстоять свой выбор...

Ну, а кого интересуют цифры и программные тезисы — пусть почитают в газетах. На слух это плохо воспринимается.

## Камуністы марылі пра прэзідэнта

*Ідэя ўвядзення ў Беларусі пасады прэзідэнта абмяркоўвалася ў 1990—1991 гадах у ЦК КПБ.*

Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінску выканаўца абавязкаў дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Даніловіч.

Паводле яго слоў, пра гэта нядаўна даведаліся даследчыкі з аддзела беларускай дзяржаўнасці навуковай установы падчас працы ў Нацыянальным архіве Беларусі.

Дакументы, выяўленыя навукоўцамі, сведчаць аб тым, што неабходнасць увядзення пасады прэзідэнта актыўна абмяркоўвалася кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Беларусі ў канцы 1990-га -- на пачатку 1991 гадоў. Паводле яго слоў, нават было падрыхтавана абгрунтаванне для ўвядзення гэтай пасады і ўсё было гатова для рэалізацыі гэтай ідэі на практыцы. І толькі імклівае развіццё падзей, а таксама развал СССР у 1991 годзе адклалі рэалізацыю гэтай ідэі да 1994 года, сказаў Даніловіч.

**Марат ГАРАВЫ,**
**БелаПАН.**

## «Справа Байковай» пайшла ў суд

Матэрыялы крымінальнай справы ў дачыненні да старшага следчага па асабліва важных справах Генеральнай пракуратуры Святланы Байковай накіраваныя ў Вярхоўны суд.

Як стала вядома БелаПАН, гэта адбылося 23 лістапада. Цяпер Вярхоўнаму суду неабходна вызначыць падследнасць крымінальнай справы ў дачыненні да работніка Генпракуратуры.

Байкова абвінавачваецца ва ўчыненні злачынстваў па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса, у тым ліку па артыкуле 399 (незаконнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці) і 426 (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў).

Святлана Байкова была затрыманая супрацоўнікамі КДБ 25 лютага на працоўным месцы па падазрэнні ў перавышэнні ўлады.

Наглядальнікі чакалі, што генеральны пракурор Рыгор Васілевіч адмовіцца падтрымліваць абвінавачанне ў судзе. Аднак Васілевіч на дэмарш не пайшоў і спіхнуў справу на старшыню Вярхоўнага суда Алега Сукалу.



*Віталь РЫМАШЭЎСКІ*

## З хрысціянскай дэмакратыяй Беларусь будзе заможнай!

*Тэлевыступлення кандыдата на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Віталя Рымашэўскага*

Дарагія сябры! Браты і сёстры! Я рады вітаць вас сёння ў прамым эфіры.

Мяне завуць Віталь Рымашэўскі, і я прадстаўляю першую ў Беларусі народную партыю — “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”.

Найперш я хачу падзякаваць тым больш як ста тысячам грамадзянам Беларусі, якія паставілі свае подпісы ў маю падтрымку, і беларускім хрысціянскім дэмакратам, якія сабралі гэтыя подпісы.

Дзякую за давер, аказаны мне. Прыкладу ўсе намаганні, каб быць годным гэтага даверу.

Толькі дзякуючы вам я сёння маю гэтыя паўгадзіны ў прамым эфіры. Мы з вамі дамагліся гэтага, і я перакананы, што зможам дамагчыся перамогі.

### Пра сябе

Мне 35 год. Беларус. Жыхар Мінска. Жанаты, маю дачку.

Адукацыя вышэйшая, інжынербудаўнік. Скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт (былы БДПА).

Пасля навучання працаваў па спецыяльнасці. Затым пачаў займацца прыватным бізнесам.

Зараз працую намеснікам старшыні па міжнародных сувязях арганізацыі “Хрысціянская дзелавая ініцыятыва”. Гэта арганізацыя дапамагае простым людзям пачаць свой бізнес, адкрыць сваю справу.

Займаюся палітыкай з 1997 года.

У 2002—2004 гг. — быў членам Прэзідыума Беларускай нацыянальнай рады маладзёжных арганізацый “Рада”. Адзін з распрацоўшчыкаў “Канцэпцыі новай маладзёжнай палітыкі Беларусі”.

Навучаўся ў Германіі на курсах Вышэйшай школы дзяржаўнага кіравання, вывучаў эканамічнае і палітычнае ўладкаванне ФРГ і Польшчы.

Праваслаўны хрысціянін, маю багаслоўскую адукацыю.

Я — сустаршыня аргкамітэта па стварэнні першай у Беларусі народнай партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”.

Я разам з паплечнікамі ствараю гэтую партыю, таму што ведаю — адзін чалавек у нашай краіне нічога не можа.

Беларуская ўлада паважае толькі адну пазіцыю — пазіцыю сілы. А моцныя людзі толькі тады, калі яны аб’яднаныя разам і бароняць адзін аднаго.

*(Працяг на 2-й стар.)*



*Уладзімір НЯКЛЯЕЎ*

## Я прыйшоў, каб вы перамаглі...

*Радыёвыступленне кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Някляева*

Добры дзень, дарагія мае землякі! Мяне завуць Уладзімір Някляеў, я — кандытат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь — і яшчэ раз кажу вам: добры дзень! Усяго найдобрага жадаю беларусам, рускім, украінцам, палякам, татарам, габрэям — усім, хто прыйдзе 19 снежня на выбарчыя ўчасткі і прагаласуе за новага прэзідэнта — за Уладзіміра Някляева.

Чаму за Някляева, а не за некага іншага? А толькі па адной прычыне: каб лепей жыць. Галасуйце за Някляева — і жыццё ваша стане лепшае.

Нехта з вас, можа быць, зараз падумаў: а ці не той гэта Уладзімір Някляеў, які паэт і які песні піша? “Гуляць дык гуляць...” ды іншыя, якія спявае ўся Беларусь.

Так, я той самы Уладзімір Някляеў, які напісаў гэтыя песні, іншага Уладзіміра Някляева ў Беларусі няма. Але я ўжо даўно займаюся не песнямі, не паэзіяй, а палітыкай. Бо паэзія жыццё наша можа ўпрыгожыць, але не змяніць. А я хачу яго змяніць. Палепшыць. І ведаю як. І калі нехта вам будзе казаць, што паэт Уладзімір Някляеў мала што разумее ў палітыцы і не можа быць прэзідэнтам, — не верце! Бо я ўжо даказаў, што я палітык. Я стварыў грамадзянскую кампанію “Гавары праўду!” — самую моцную грамадскую арганізацыю ў Беларусі. Мяне і маіх таварышаў за гэта арыштоўвалі, канфіскоўвалі маёмасць кампаніі, запалохвалі нас судом і турмой, але не змаглі запалохаць. Кампанія “Гавары праўду!” як дзейнічала, так і дзейнічае. Яна не звязаная ні з уладай, ні з апазіцыяй: яна працуе самастойна на карысць простых людзей. На вашу карысць. Менавіта кампанія “Гавары праўду!”, якая мае 35 рэгіянальных штабоў і тры з паловай тысячы актывістаў ва ўсіх кутках Беларусі, дапамагла мне сабраць больш за 200.000 подпісаў для таго, каб я стаў кандыдатам у прэзідэнты. Дзякуючы агітацыі, якую кампанія праводзіць за Някляева, мой рэйтынг сёння складае 17 працэнтаў — гэта значна больш за рэйтынг любога іншага саперніка Лукашэнкі. А гэта значыць, што ў Някляева найбольшы шанс на перамогу на прэзідэнцкіх выбарах.

*(Працяг на 3-й стар.)*



*Андрей САННИКОВ*

## История делается сегодня. И мы победим

*Телевыступление кандидата в президенты Беларуси Андрея Санникова*

Добрый вечер, дорогие соотечественники!

Представьте: 20 декабря мы победили, и диктатура ушла в прошлое, а Лукашенко на личном самолете бежал в Венесуэлу. Миллионы людей с криками “Ура!” и “Жыве Беларусь!” вышли на улицы. Белорусское телевидение ведет прямую трансляцию с улиц Минска.

16 лет мы ждали этой победы. И вот этот день наступил. Мы наконец избавились от коррупционеров и казнокрадов, от засевшей во власти мафиозной группировки.

Каждый из нас мечтает жить в свободной Беларуси, где царят благополучие, уважение к человеку, где жить безопасно, спокойно и радостно. 19 декабря мы можем наконец эту мечту сделать былью. Выбрать именно ту Беларусь, о которой давно мечтаем.

Меня зовут Андрей Санников. Я кандидат в президенты Республики Беларусь и руководитель гражданской кампании “Европейская Беларусь”.

Лукашенко уже проиграл. Прошел сбор подписей, и все увидели, что возле стендов с его портретом было пусто. В пикеты по сбору подписей за него насильно сгоняли учителей и воспитателей детских садов. Но никто не подходил к этим пикетам. Потому что у Лукашенко в народе уже нет поддержки.

И он это знает. Он даже побоялся лично прийти на регистрацию кандидатов в президенты. Меня после регистрации встречали на площади мои друзья, близкие и просто незнакомые люди, которые пришли поздравить и сказать слова поддержки. Поздравить Лукашенко не пришел ни один человек. Министр образования Радьков, получивший за него удостоверение кандидата, вышел из Дворца Республики никем не замеченный и никому не интересный.

До смены власти и освобождения страны осталось всего несколько недель. А пока Беларусь называют последней диктатурой Европы, и называют справедливо. Мы точно знаем тот момент, когда Беларусь начала скатываться к диктатуре. 14 ноября 1996 года председатель Центризбиркома Виктор Гончар был незаконно смещен со своей должности перед референдумом. Тот год должен был стать для Лукашенко последним. Референдум, который он проводил для уничтожения нашей Конституции и полного присвоения власти, был незаконным.

*(Працяг на 2—3-й стар.)*

*Віталь РЫМАШЭЎСКІ*

# З хрысціянскай дэмакратыяй Беларусь будзе заможнай!

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

І мы ўжо даказалі, што дамагчыся змен можна нават у нашай краіне.

Нягледзячы на фальсіфікацыю выбараў, мы маем трох дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Разам з цэрквамі мы дамагліся забароны рэкламы магіі і акультызму на беларускім тэлебачанні і ў газетах. Спынілі гэтую крыніцу абкрадання і падману беларусаў. Правялі шмат мясцовых кампаній.

Мы разумеем: для таго каб да лепшага змянілася жыццё нашай краіны, мала проста замяніць прэзідэнта. Мы павінны за аснову нашай эканомікі, палітыкі, сацыяльнага жыцця ўзяць хрысціянскія прынцыпы. Яны ўсім даўно вядомыя: не забівай, не крадзі, не хлусі, паважай сваіх бацькоў, паважай жыццё і маёмасць іншага чалавека... На гэтых каштоўнасцях нашы прадзеды будавалі Беларусь тысячу гадоў. І так беларусы павінны жыць сёння.

Прыклад краін, дзе хрысціянскія дэмакраты ў парламенце і ва ўладзе, — Германія, Літва, Нарвегія, Швецыя.

Але, можа быць, у нашай краіне і так усё добра? Можа, не трэба нічога мяняць?

Выбіралі прэзідэнта, а атрымалі цара, які турбуецца пра сваіх сыноў і набіванне кішэняў сваім чыноўнікам! Можа, так яно і трэба?

Падчас гэтай кампаніі я правёў сустрэчы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, сустракаўся з многімі людзьмі. Я ведаю, што сёння ўлада абараняе толькі інтарэсы чыноўнікаў і сілавых структур. Карупцыя дасягнула 100 працэнтаў. Чым меншы населены пункт — тым больш карупцыі. Міліцыя, выканкам, суды — абараняюць адзін аднаго. Нам расказваюць байкі пра тое, што ў гэтай краіне ўлада змагаецца з карупцыяй: уся дзяржаўная сістэма за 16 гадоў плодзіць гэтую карупцыю ў неверагодных маштабах. У кожным раёне, у кожнай галіне гаспадаркі — свая мафія. Уся сістэма працуе на хабарах і адкатах.

Простаму чалавеку немагчыма абараніць праўду на працы, у судзе, забяспечыць годнае жыццё сабе і сваёй сям'і.

Сітуацыя з коштамі на прадукты пераходзіць ужо ЎСЕ МЕЖЫ. З экранаў тэлебачання нам распавядаюць, што жыць становіцца ўсё лепш і лепш, а прыходзіш у краму і разумееш, што на якасныя прадукты зарплаты не хапае. Кошты за апошні год непамерна выраслі, і прагназуецца іх ДАЛЕЙШЫ РОСТ.

Пенсіі і стыпендыі, заробкі павышаюць на 10 працэнтаў, а кошты — на 20 працэнтаў! Кошты на прадукты ў нас такія, як у Літве і Польшчы, а заробкі?

У людзей забралі льготы!

Ахова здароўя, як вядома, даўно па факце ўжо не з'яўляецца бясплатнай. Жадаеш хутка і якасна — плаці. Жадаеш як бы бясплатна — стой у чарзе і хварэй.

У каго ёсць сэрца, той не можа не адчуць таго болю, той несправядлівасці, у якой жыве просты беларускі народ.

Улада да людзей ставіцца як да быдла.

А чаму?

Таму што беларуская ўлада сёння не залежыць ад людзей. Выбары — фальсіфікуюцца, чыноўнікі — адказныя толькі перад прэзідэнтам, а не перад народам.

Беларусь выйшла ў лідары ў свеце па колькасці самагубстваў. Кожны год рабіцца каля 50 тысяч абортаў. Усё гэта мы можам назваць толькі нацыянальнай катастрофай. А ўлада кажа, што ў нас усё стабільна.

Сапраўды стабільна і ціха — ЯК НА МОГІЛКАХ.

За 16 гадоў кіравання Лукашэнкі колькасць насельніцтва скарацілася на 850 тысяч чалавек (нам кажуць: гэта як у Еўропе — дэмаграфічны крызіс, — але гэта хлусня!), 62 працэнты з іх не дажылі да пенсіённага ўзросту! У нас людзі на 20 год раней паміраюць, чым у Еўропе.

У мінулую пятніцу, 19 лістапада, у аўтакатастрофе пад Маладзечнам загінуў акадэмік Іван Нікітчанка.

Гэты чалавек быў адной з 30 маіх давераных асоб. Ён даказаў, што беларускія ўлады на працягу 16 гадоў труцяць беларусаў радыяцыяй. Радыеактыўныя прадукты з забруджаных зон трапляюць у крамы ЎСІХ гарадоў Беларусі. Згодна з праведзеным ім даследаваннем перавышэнне доз радыяцыі ёсць у кожнага трэцяга жыхара Мінска (у Бабруйску і Горках — у двух з трох). Людзі хварэюць і паміраюць. Улада — хавае статыстыку і маўчыць. Паспрабуйце даведацца хоць на адным рынку Беларусі дадзеныя пра ўзровень радыяцыі ў купленых вамі прадуктах...

У ліквідатараў чарнобыльскай катастрофы адабралі льготы. Затое пакінулі іх чыноўнікам, якія нават не ведаюць, дзе знаходзіцца Чарнобыль.

Мы будзем патрабаваць незалежнага расследавання смерці акадэміка Нікітчанкі. Мы спынім злачыннае атручванне беларусаў радыяцыяй!

Паўсюль — на працы, на вучобе, на вуліцы — палохаюць. Начальства, міліцыя, КДБ, вертыкаль, кантралёры, мясцовая ўлада... Усё ж на страху трымаецца.

Дзе зніклыя апаненты Лукашэнкі? Дзе Ганчар, Захаранка, Красоўскі, Завадскі? Для чаго ў турме трымаюць Аўтуховіча, прадпрымальнікаў, моладзь? Каб іншыя баяліся. Але — хопіць! Прыйшоў час скончыць гэтыя 16 гадоў страху! Хопіць страху!

Мы памятаем самых выбітных дыктатараў, і мы памятаем, да чаго яны прывялі свае краіны!

Сёння мы кажам: "Хопіць дыктатуры!"

Многія задаюць пытанні: "А што замест?", "Што пасля?"

Я разумею, што для таго, каб змяніць краіну, патрэбна моцная каманда.

Таму за маімі плячыма стаіць народная партыя — "Беларуская хрысцінская дэмакратыя". Гэта каманда прафесіяналаў: навукоўцы, акадэмікі, эканамісты, вайскоўцы, юрысты, — сотні веруючых, сумленных і шчырых людзей!

Наш знак — віфліемская зорка.

Гэта традыцыйны беларускі сімвал: зорка, што з'явілася на небе, калі нарадзіўся Ісус Хрыстос. Гэта зорка сімвалізуе нараджэнне новага жыцця для Беларусі. Калі ўбачыце гэту зорку, то ведайце: гэта знак народнай партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя".

Далучайцеся!

Тэлефануйце: 8029 167 34 35

Наш сайт — www.bchd.info

## Што прапануе БХД

Народная партыя "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" прапануе новую канцэпцыю нацыянальнай беларускай палітыкі:

— Беларуская палітыка павінна быць арыентавана на чалавека, на Беларусь і на хрысціянскія каштоўнасці.

— Калі мы прыйдзем да ўлады, палітыка будзе прабеларуская і палітыка будзе хрысціянская.

— Прабеларуская — значыць арыентаваная не на Усход, не на Захад, а на патрэбы і інтарэсы Беларусі.

— Хрысціянская — значыць арыентаваная на чалавека, калі патрэбы простага чалавека, сям'і будуць абсалютным прыярытэтам для беларускай дзяржавы.

— Хрысціянская палітыка — значыць цярпімая і талерантная да іншадумства. Мы пабудуем грамадства для веруючых і няверуючых, дзе будзе абсалютная павага да свабоды чалавечай асобы. Ніхто не будзе мець права ўмешвацца ў прыватнае жыццё чалавека.

Але хрысціянская — гэта азначае таксама, што хрысціянскія каштоўнасці, евангельскія прынцыпы будуць узяты за аснову жыцця грамадства.

Беларусь — хрысціянская краіна.

Наша праграма — змяніць усю сістэму.

Сёння кіраўнікоў прадпрыемстваў, дзяржаўных устаноў прызначаюць па прынцыпе лаяльнасці прэзідэнту, сваяцкіх сувязяў. Першае, што мы зробім, — прызначым кіраваць прадпрыемствамі і дзяржаўнымі ўстановамі прафесіяналаў, хрысціян, сумленных людзей.

## Медыцына

Зараз з нашых падаткаў плацяць грошы на ўтрыманне бюракратычнай медыцынскай сістэмы. Пры гэтым кажуць, што медыцына ў нас бясплатная.

Мы спынім фінансаванне бюракратаў. Грошы за лячэнне будуць пералічвацца непасрэдна дактарам, а не праз Міністэрства аховы здароўя, дзе на дадзены момант большасць сродкаў раскрадаецца.

## Пенсіі

Нам кажуць, 500 тысяч — вялікая пенсія. Гэта каля 100 еўра!

Нямецкія пенсіянеры атрымліваюць пенсіі, на якія могуць падарожнічаць па ўсім свеце!

А нашы бацькі вымушаны працаваць пасля выхаду на пенсію, каб хоць неяк дапамагчы сваім дзецям, пражыць самім. Таму — хварэюць і рана паміраюць. Няўжо нашы з вамі бацькі не заслужылі годнага жыцця?!

Нашы з вамі бацькі заслужылі, каб жыць не горш як пенсіянеры ў Еўропе.

Павысіць пенсіі да еўрапейскага ўзроўню проста, дастаткова аддаць па 20 працэнтаў акцый вядучых прадпрыемстваў Беларусі ("Беларуськалій", нафтаперапрацоўчыя заводы) у пенсіённы фонд.

## Эканоміка

Створым максімальна спрыяльныя ўмовы для бізнесу і дадзім максімальныя сацыяльныя гарантыі. Гэта магчыма сумясціць. Прыклад таму — Германія. Там хрысціянскія дэмакраты пры ўладзе. Там самая моцная эканоміка, бізнес, і адначасова амаль самыя высокія пенсіі ў Еўропе.

Беларусь — еўрапейская краіна, якая размяшчаецца ў самым сэрцы Еўропы, і БХД збудуе ў Беларусі сапраўдную еўрапейскую эканоміку, заснаваную на навука- і працаёмістай вытворчасці, транзіце, сэрвісе, інфармацыйных тэхналогіях.

## Бізнес

Апошнія гады ўлада займалася тым, што душыла прадпрымальнікаў.

Падатковая інспекцыя дзейнічае як рэпрэсіўная машына. Мы гэта спынім!

Заснаваць сваю справу можна будзе на працягу аднаго дня.

Кожны беларус зможа палічыць свае падаткі на калькулятары.

Мы спынім абкраданне беларускіх грамадзян. Адменім пошліны на аўтамабілі з Еўропы!

З Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ ЗАМОЖНАЙ!

Распрацаваная намі Эканамічная Канстытуцыя — гарант правоў і абаронца інтарэсаў інвестараў.

Крэдыты ў Беларусі будуць не болей за 3 працэнты.

Такія крэдыты ў Еўропе. Лукашэнка бярэ еўрапейскія крэдыты па такіх працэнтах і прадае народу па 14—17 працэнтаў. Вось так улада турбуецца пра беларусаў!

## Заробкі

Асновай беларускай эканомікі павінны быць высокія даходы тых людзей, хто працуе. Большасць беларускіх прадпрыемстваў нерэнтабельныя, бо людзі не маюць кантролю за кіраўніцтвам прадпрыемства.

Мы адменім кантрактную сістэму.

Мы створым свабодныя прафсаюзы, будзем кантраляваць, куды ідуць заробленыя грошы.

Адкуль узяць на рэформы грошы? Усё проста — спыніць карупцыю. І не падманваць замежных інвестараў. Тады грошы прыйдуць у Беларусь.

Грошы ёсць, але яны раскрадаюцца, будуюцца палацы, адкрываюцца замежныя рахункі.

Колькасць чыноўнікаў паменшым у тры разы: менш чыноўнікаў — менш карупцыі.

Беларуская хрысціянская дэмакратыя гуртуе тысячы веруючых, сумленных людзей, каб змяніць саму сутнасць сістэмы: не красці, не хлусіць, не баяцца.

Спыніць карупцыю мы можам толькі разам, калі ўлада будзе не прызначацца, а абірацца.

Таму БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНА САМАКІРАВАННЕ!

Мэры гарадоў, мястэчак і нават вёсак будуць выбірацца мясцовымі жыхарамі, а не прызначацца зверху. Мы правядзём выбары ўсіх узроўняў без фальсіфікацый.

Правядзём адміністрацыйную рэформу.

Беларусь будзе падзеленая не на шэсць, а на 23 вобласці.

Апроч Брэста, Гродна, Віцебска, Мінска, Магілёва і Гомеля сталіцамі абласцей стануць: Кобрын, Пінск, Жыткавічы, Мазыр, Рэчыца, Крычаў, Орша, Полацк, Глыбокае, Барысаў, Маладзечна, Ліда, Смаргонь, Баранавічы, Слуцк, Ваўкавыск, Бабруйск.

УСЮ МОЦ ДЗЯРЖАВЫ накіруем НА ПАДТРЫМКУ СЯМ'І.

Дапамога па доглядзе за дзіцем будзе ў памеры сярэдняга заробку на кожнае дзіця да 5 год і паловы сярэдняга заробку на дзіця да 10 год.

Толькі так можна спыніць дэмаграфічны крызіс.

## Кошты на кватэры

У большасці гарадоў неапраўдана завышаныя кошты на жыллё, на коштах мінскіх кватэр нажываецца Лужкоў і іншыя. Мы спынім карупцыйныя схемы, увядзём іпатэку.

## Адукацыя

Вернем ільготы беларускім студэнтам. Вернем бясплатную адукацыю для ўсіх.

Адменім сучаснае "прыгоннага права" ў Беларусі — прымусовае размеркаванне.

Адменім кантрактную сістэму ў адносінах да настаўнікаў. Сярэдні заробак настаўнікаў — да ўзроўню сярэдняга заробку ў дзяржаўных установах.

Праваахоўныя органы і міліцыя будуць пазбаўлены ад умяшальніцтва ў іх прафесійныя справы з боку ўлады і спецслужбаў. Ніхто не павінен замінаць працы міліцыі.

Афіцэры міліцыі, тыя, хто бароніць нас ад бандытызму, будуць бесперашкодна выконваць свае абавязкі. А "пярэваратні ў пагонах " будуць сядзець у турме.

## Беларускія турмы

У Беларусі людзей садзяць у турму за дробныя парушэнні закону. А тыя, хто крадзе мільёны, — на свабодзе.

Сёння сістэма пакарання ў Беларусі не выпраўляе людзей, а робіць з іх бандытаў.

Турма павінна выпраўляць чалавека, а не калечыць.

## Беларускае войска

У Беларусі будзе прафесійнае мабільнае войска. Абавязковая служба ў войску будзе заменена на вайсковыя зборы працягласцю да шасці месяцаў.

Заробкі афіцэраў будуць не ніжэй, чым заробкі ў спецслужбаў.

## Знешняя палітыка

Мы ўсталюем узаемавыгадныя сяброўскія адносіны з Расіяй, і наладзім партнёрскія стасункі з Заходняй Еўропай. Для беларусаў не патрэбны будуць візы, каб трапіць у Еўрапейскі Саюз.

Беларусь — нейтральная краіна!

Беларуская хрысціянская дэмакратыя гарантуе бяз'ядзерны статус Беларусі і няўдзел Беларусі ў вайсковых канфліктах за межамі краіны.

## Белорусский язык и культура

Мы никого не будем заставлять учить белорусский язык.

Возродить белорусскую культуру, белорусский язык можно только тогда, когда народ будет их любить. Нельзя заставить любить.

Я верю, что у нашего народа есть духовные силы, чтобы защитить и возродить свою культуру без всякого насилия и принуждения.

Мы дадим каждому возможность получать образование на том языке, на каком захочет. И мы будем помогать тем, кто хочет пользоваться белорусским языком в школе, на рабочем месте.

Сегодня я обращаюсь к вам по-белорусски, хотя знаю, что многие не говорят на *роднай мове*, но я верю, что мы поймем друг друга.

Сегодня белорусский язык так редко звучит на телевидении, буду рад, если мое выступление послужит примером для других.

Нас долго делили на оппозицию и тех, кто за власть, на белорусскоязычных и русскоязычных. Сеяли вражду среди нас.

Нам надо твердо ответить сегодня, что, несмотря на разные языки и национальнасти, мы один народ. Мы умеем ценить свою культуру и умеем уважать друг друга.

Для беларускай хрысціянскай дэмакратыі Беларусь — гэта свабода!

Найперш, мы забяспечым поўную свабоду веры.

Я праваслаўны хрысціянін. Я выбіраў гэтую царкву сам і вельмі хацеў бы, каб прыгажосць праваслаўя была адкрыта для іншых людзей. Але я ведаю, што веру немагчыма навязаць гвалтам. Сярод маіх сяброў і знаёмых шмат людзей іншых канфесій і нават няверуючых людзей. Я паважаю іх права на свабодны выбар. Дзяржава не павінна дыктаваць чалавеку, як яму верыць, умешвацца ў прыватнае жыццё чалавека.

Закон павінен быць роўны для ўсіх. І забараняць трэба толькі тое, што наносіць шкоду здароўю альбо дабрабыту людзей.

А сёння па законе за сумеснае чытанне Бібліі вас могуць пасадзіць у турму альбо даць штраф.

Нават праваслаўнай царкве з вялікімі цяжкасцямі ўдаецца атрымаць дазвол на будаўніцтва новых храмаў. А вось для казіно, якія абкрадаюць людзей, — месцаў хоць адбаўляй.

Дайшло да таго, што памяшканне былога манастыра ў цэнтры Мінска ўлады не аддаюць вернікам, а робяць там гатэль і бардэль.

Мы вернем цэрквам іх будынкі. Перададзім ім пустуючыя будынкі для наладжвання хоспісаў, сталовых, нядзельных школ.

У той жа час мы спынім прапаганду разбэшчанасці. Мы вынесем казіно за тэрыторыі населеных пунктаў.

Кампанія Беларускай хрысціянскай дэмакратыі робіцца выключна за беларускія грошы, бо я перакананы, што палітыка толькі тады будзе сапраўды незалежнай, калі будзе фінансавацца беларусамі. Я дзякую ўсім тым, хто ахвяраваў грошы на маю кампанію.

Мы просім вас падтрымаць сапраўды беларускую палітыку і зрабіць свой унёсак.

Я звяртаюся сёння да ўсіх хрысціян Беларусі. Дарагія браты і сёстры!

Улада — гэта вялікая спакуса для кожнага чалавека, і калі ў нас, хрысціян, не будзе сіл справіцца з гэтай спакусай, то дарэмна чакаць, што гэтыя сілы з'явяцца ў няверуючага чалавека.

Усе людзі ад палітыкаў, прадстаўнікоў улады чакаюць аднаго, самага галоўнага — што іх не падмануць, што ва ўладзе будуць людзі, якім можна верыць і давяраць, што да іх будуць ставіцца з павагай. Таму заклікаю ўсіх хрысціян і проста ўсіх сумленных людзей Беларусі ўдзельнічаць у палітычным жыцці, ісці ва ўладу.

Імя Хрыстова павінна шанавацца ў нашай краіне, у сям'і, у школе, на працы, у палітыцы. Там, дзе ёсць хрысціяне, — там ёсць Хрыстос, а значыць, ёсць надзея для гэтага свету, для Беларусі.

Таму я заклікаю вас далучацца да гэтай кампаніі, да Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

На жаль, усім даўно вядома, што ў нашай краіне важна не як галасуюць, а як лічаць.

Таму мала проста прагаласаваць, важна не даць уладзе сфальсіфікаваць выбары.

У выбарчыя камісіі практычна не ўключаны прадстаўнікі дэмакратычных сіл, улада прымушае студэнтаў і працоўных ісці на датэрміновае галасаванне, і ніхто не можа пракантраляваць працу камісій і гарантаваць, што бюлетэні не заменяць ноччу.

Таму заклікаю: не ідзіце на датэрміновае галасаванне, ідзіце галасаваць толькі ў дзень выбараў. Мы павінны разам пракантраляваць гэтыя выбары, запісвайцеся ў назіральнікі. Для гэтага дастаткова звязацца з намі па гэтым тэлефоне, мы падкажам, як гэта зрабіць.

Разам мы мусім пракантраляваць гэтыя выбары...

Будзе сустрэча з назіральнікамі. Калі выбары адбудуцца сумленна — будзе другі тур. Павіншуем адзін аднаго з перамогай.

Калі ж выбары будуць сфальсіфікаваныя — будзем дамагацца новых выбараў разам!

Народ мае канстытуцыйнае права на нацыянальную забастоўку.

Улада павінна зразумець, што яна залежыць ад народа!

Прыходзьце! Разам нас будуць дзясяткі тысяч. Мы зменім сістэму!

Я прашу вас: не бойцеся, бо жыццё і простага чалавека, і прэзідэнта знаходзіцца ў руках Божых. Ён бароніць кожнага з нас і нашу Беларусь.

Як кажуць хрысціянскія дэмакраты: Жыве Беларусь — Жыве з Богам!

### АД РЭДАКЦЫІ

*Вымушаны ўдакладніць: партыя "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" пакуль афіцыйна не зарэгістравана. Нягледзячы на некалькі спроб, Міністэрства юстыцыі не дало згоду на яе дзяржаўнае прызнанне.*

*І яшчэ: паколькі Генеральная пракуратура вынесла папярэджанне сп.Рымашэўскаму за заклік да выбаршчыкаў сустрэцца 24 лістапада на Кастрычніцкай плошчы, то гэтую фразу рэдакцыя вымушана апусціць.*

*Андрей САННИКОВ*

# История делается сегодня.

И Гончар не допустил бы этого референдума. Лукашенко с помощью молодчиков из своей охраны вышвырнул Виктора Гончара из Центризбиркома и поставил на его место своего человека — юрисконсульта из Бобруйска Лидию Ермошину, главная задача которой с тех пор — фальсифицировать выборы, не допускать к подсчету голосов наблюдателей, прикрывать вброс пачек фальшивых бюллетеней в избирательные урны. Ни одни выборы и ни один референдум, проведенные Ермошиной, не признаны мировым сообществом. Сегодня против Ермошиной действуют международные санкции, как и против тех силовиков, которых подозревают в убийствах лидеров оппозиции. Даже против Лукашенко санкции приостановлены. О каких честных выборах может идти речь?

Именно тогда, в ноябре 1996 года, я ушел в отставку с поста заместителя министра иностранных дел Беларуси. Я очень любил свою работу. Я был счастлив работать ради независимости нашей родины, помогать росту ее авторитета в мире. Но не мог оставаться на государственной службе после того, как в стране перестали работать законы, а разделение властей было уничтожено окончательно. Я понял, что нужно бороться за возвращение в Беларусь законности. Поймите меня. Я профессиональный дипломат, пришел в систему МИД при нашем земляке Андрее Андреевиче Громыко. Я видел, что так же, как Лукашенко обманывал народ, он обманывал и наших международных партнеров. Я не хотел быть к этому причастен.

Разделение властей — основа любого нормального общества. Парламентская власть или президентская — неважно. Одна ветвь власти контролирует другую, и в то же время все ветви власти независимы друг от друга: парламент, правительство, суд. Зачем Лукашенко уничтожил независимость всех ветвей власти? Затем, что иначе ему пришлось бы держать ответ перед парламентом, в котором тогда было достаточно сильных политиков, понимавших, что происходит в стране. Это было нужно для того, чтобы бесконтрольно присваивать наши деньги, создавать свои личные, никем не контролируемые фонды за счет народа. Он рассказывает нам, что наши налоги идут на заработные платы врачам и педагогам. Но давайте спросим педагогов и врачей, довольны ли они своими зарплатами? Конечно, нет! При этом Беларусь долгое время занимала одно из первых мест в мире по количеству налогов, которыми облагают граждан. Так куда идут наши деньги? Они идут в личный карман Лукашенко, на наши деньги он вывозит огромную свиту на горнолыжный отдых, содержит бежавшего из Киргизии диктатора Курманбека Бакиева, который живет здесь как падишах за наш счет, устраивает для себя праздники. Даже "Дожинки" не имеют ничего общего с народной традицией окончания сбора урожая, а превратились в показуху для диктатора. На эти деньги можно было бы вылечить тысячи больных детей, которым Минздрав отказывает в оплате лечения — в бюджете нет денег на лечение больных детей. И мы вынуждены собирать их всем миром. Обратите внимание, сколько счетов для перечисления средств больным детям висит в каждой сберкассе. Государство отказалось им помогать, и максимум, что может сделать для них, — это дать разрешение на открытие счета.

В 1996 году, когда Лукашенко незаконно захватил всю власть в государстве, он утратил право называться избранным президентом Беларуси. Он стал обычным узурпатором — как предводители латиноамериканских хунт и африканские диктаторы-людоеды, как мелкие фюреры вроде Чаушеску. Из-за этого Беларусь задержалась в своем развитии на долгие годы.

Пока диктаторы незаконно удерживают власть, они пытаются убедить народ в том, что страна процветает. Но белорусы — мудрый народ. Белорусы давно не верят сказкам Лукашенко. Они хотят жить в нормальной, свободной, благополучной стране. Так почему незаконное удержание власти продолжается уже 14 лет?

Есть две причины. Первая: этот режим еще в конце девяностых убил тех лидеров, которые могли бы противостоять Лукашенко. 7 апреля 1999 года при странных обстоятельствах умер мой друг Геннадий Дмитриевич Карпенко — член-корреспондент АН, вице-спикер Верховного Совета, создавший теневое правительство и готовый взять на себя ответственность за освобождение Беларуси от этой наглой диктатуры. Если бы Геннадий Карпенко остался жив, мы бы давно жили в новой, счастливой стране.

7 мая 1999 года был похищен и убит Юрий Захаренко — бывший министр внутренних дел, государственная карьера которого закончилась в тот момент, когда на утверждение Лукашенко "ты должен выполнить любой приказ президента" он ответил: стрелять в людей я не буду. Он сохранил честь офицера, но потерял жизнь. Юрия Захаренко уважали и милиция, и армия. Если бы он остался жив, Беларусь уже была бы свободной.

Виктор Гончар вместе со своим другом Анатолием Красовским был похищен и убит 16 сентября 1999 года. Гончар не допустил бы произвола и беззакония. Если бы он остался жив, наши голоса на выборах не отправлялись бы в мусор прямо из избирательных урн. Мы давно восстановили бы свое право выбирать. Я их знал, этих сильных людей, работал с ними и видел в них лидеров свободной Беларуси. Сегодня я защищаю те же принципы, которые защищали они.

Недавно мы обратились к пяти государствам — членам Совета безопасности ООН с просьбой провести международное расследование похищений людей в Беларуси. После этого президент России Дмитрий Медведев в своем видеообращении поднял вопрос о похищенных белорусских лидерах. Я благодарен Дмитрию Анатольевичу Медведеву за то, что эта трагическая для всех нас тема наконец зазвучала в России. Я уверен, очень скоро дела о похищениях будут раскрыты, а виновные понесут наказание.

Вторая причина долголетия диктатуры — это терпение белорусского народа. Лукашенко запугал многих, превратив людей в рабов контрактной системы. Одно неосторожно брошенное слово может стоить человеку работы. С ним просто не продлят контракт. И это самый простой способ заставить людей бояться собственной тени и думать только о том, как бы не сболтнуть лишнего.

*Этот материал планировалось посвятить выступлению солиста оперной студии Амстердама Анатолия Сивко в программе "Незабываемый вечер Belcanto". Но, к сожалению, "Народная Воля" не может осветить это событие. И вот почему...*

Ничто не предвещало беды. Обычное объявление о пресс-конференции, обычный звонок в Национальный пресс-центр, который занимался аккредитацией. Все формальности улажены, меня без лишних вопросов записали в число журналистов, которые могут задать вопрос одному из участников пресс-конференции — художественному руководителю Президентского оркестра Республики Беларусь **Виктору Бабарикину** или главному дирижеру **Херардо Эстрада** из Венесуэлы. Оставалось только прийти на встречу. Вот тут-то и начались совершенно неожиданные проблемы.



Дворец Республики — одно из главных зданий в столице. Как бы стратегический объект. Наверное, именно поэтому на всех служебных выходах есть блокпосты. Не просто тривиальный столик консьержа, а полномасштабные, оборудованные пропускные пункты с компьютерами, турникетами и несколькими охранниками. Чтобы попасть в коридоры Дворца, нужно либо предъявить пропуск, либо дождаться тех, кто сможет вас забрать. Таких желающих попасть в храм искусства очень много. Во-первых, из-за того, что Дворец Республики — очень крупное заведение, в котором одновременно решаются сотни вопросов. Что-то привозят, где-то надо расписаться, приехали гости, уезжают музыканты... Во-вторых, в здании располагается несколько офисов разнообразных фирм. Через нужный мне служебный вход №1 в здания попадают клиенты риэлтерской фирмы, девушки, которые занимаются в клубе шейпинга, и многие другие. Журналистам же, которые пришли на пресс-конференцию, пришлось ждать, когда за ними придет хоть кто-то.

Как оказалось, в списке, который вручили охраннику, были вписаны только два представителя СМИ — телевидения и интернет-сайта. Все остальные журналисты, а их собралось не меньше восьми человек, с удивлением узнали, что их имен в заветном листочке нет. Проблема решалась просто. Дама-организатор собственноручно добавляла в список всех, кто изъявил желание попасть на пресс-конференцию. Почти... Как только девушка услышала название "Народная Воля", ее лицо утратило благостное выражение.

*"К сожалению, я не могу вас пропустить,* — обратилась ко мне дамочка голосом, в котором не было ни капли упомянутого сожаления. — *Руководство распорядилось, чтобы "Народную Волю" не пропустили"*.

Вот тут и настало время мне удивляться. На логичный вопрос, чем я хуже коллег из других СМИ, мадемуазель не смогла сказать ничего внятного. Походило на то, что она не ожидала, что кто-то будет требовать разъяснений. Девушке явно не хотелось говорить, поэтому она начала рассыпаться в обещаниях дать объяснения позже. Когда?

*"Ну... вечером, наверное"*, — был пространный ответ.

Аргументация незатейливая — это решение начальства, она тут ни при чем и связать меня с начальством леди тоже не может. И вообще — сейчас начинается пресс-конференция, она должна убегать. Назвать свою фамилию ведущий редактор Президентского оркестра Республики Беларусь категорически отказалась.

Коллеги из государственных СМИ проходили за проходную с потупленными глазами. Было очевидно, что людям неловко, с некоторыми из коллег я знакома, и нам в очередной раз напомнили про двойные стандарты, про "честные" и "нечестные" СМИ.

Что ж, не оставалось ничего другого, как ждать, когда таинственная незнакомка снизойдет до разговора. А пока она пропадала в коридорах Дворца, у меня было время на раздумья.

Ошибки быть не могло — в Национальном пресс-центре подтвердили, что мое имя есть в списках аккредитованных. Что еще нужно? Согласно закону "О печати и других СМИ", аккредитация — *"подтверждение права журналиста освещать мероприятия"*.

С этим логичным аргументом вроде должны согласиться все. Контраргументы могли быть только нелогичными. Например, какие-то особенные условия — модельная внешность, отсутствие вредных привычек, арийские корни... В моей сумочке лежало репортерское удостоверение государственного образца, у меня есть диплом университета с "диагнозом" — журналист. Почему я не могу реализовать свое право и попасть на пресс-конференцию? Неужели кто-то в руководстве Дворца Республики испугался, что своими неудобными вопросами я испорчу настроение гостю из дружественной нам Венесуэлы? Тем более что в начале месяца я, как и многие мои коллеги, была здесь же, во Дворце Республики, на открытии фестиваля "Лістапад", а с господином Бабарикиным не единожды беседовала. И все без эксцессов.

Через двадцать минут ожидания несчастная леди вновь предстала передо мной. Она явно не знала, что мне пообещать и как отвязаться от моих назойливых вопросов о том, почему же я, выражаясь простым языком, рожей не вышла, чтобы попасть на рядовую пресс-конференцию.

*"Лично к вам нет никаких претензий,* — лепетала Екатерина, которая представилась ведущим редактором президентского оркестра. — *Позвоните нам и мы все объясним. Если не хотите звонить, то подождите меня, и я выясню все вопросы"*.

Мою надежду на ответы развеяла все та же дамочка-организатор, которая изменилась в лице, когда через 30 минут снова увидела меня у входа. Девушка с кислой улыбкой снова пообещала вернуться и все выяснить. Я так ее и не дождалась, несколько раз она пробегала по ту сторону пропускного турникета с напускным безразличием на лице.

Звонок на следующий день ничего нового не дал.

*"Я не могу вам сообщить ничего, кроме того, что вы уже знаете,* — заявила все та же Екатерина. — *Решение принималось в администрации Дворца Республики"*.

В администрации Дворца Республики, куда мы позвонили, посоветовали написать официальный запрос, после которого, возможно, "Народной Воле" и объяснят, почему их журналист даже с аккредитацией не может попасть во Дворец Республики.

**...**Передо мною извинились. Правда, это были охранники, которые взирали на происходящее со стороны. Им было стыдно за действия работников Дворца...

Стоит отметить, что вышестоящей инстанцией Дворца Республики является Управление делами Президента Республики Беларусь.

**Мария МАЛЕВИЧ.**



**P.S. Просьба считать этот материал официальным запросом руководству Дворца Республики (директору государственного учреждения "Дворец Республики" Петру Андреевичу Волкову) и Управления делами Президента (Управляющему делами Президента Республики Беларусь Николаю Николаевичу Корбуту).**

**Надеемся получить вразумительный ответ на четко поставленный вопрос: почему журналиста "Народной Воли" не пустили на рядовую, не политическую пресс-конференцию во Дворец Республики?**



ТОЧКИ НАД «І»

*Михаил БАТУРА, ректор Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники:*

# «Выбор, за кого голосовать, каждый должен сделать сам...»

*На днях в интернете многие сайты растиражировали скандальную информацию о том, что ректор Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники якобы приказал студентам досрочно проголосовать за действующего главу государства.*

*Со ссылкой на пресс-службу гражданской кампании "Европейская Беларусь" сообщалось, что это произошло на общем собрании университета: "В своем выступлении ректор Батура Михаил Павлович заявил, что все студенты университета проголосуют досрочно за Александра Лукашенко. В ответ на возмущение студентов Батура заявил, что в случае неподчинения последуют повальные исключения".*



*"Народная Воля" сделала звонок доктору технических наук, профессору, академику Международной академии наук высшей школы Михаилу Батуре.*

— Я охотно расскажу, как все было, — *сразу согласился Михаил Павлович.* — К счастью, я уже могу об этом говорить спокойно.

Во-первых, это было не общее собрание университета, а моя традиционная встреча со студенческим активом, на которой присутствовали старосты групп, потоков, старосты этажей в общежитии и т. д. Мы всегда встречаемся, обсуждаем какие-то проблемы. Последняя встреча была очень теплой, мне в конце студенты даже цветы преподнесли...

До собрания с активом обычно проходит сбор вопросов, ответы на которые студенты хотели бы услышать от меня. Причем часть вопросов мне передают заранее — чтобы была возможность подготовиться и ответить предметно. Например, если у меня спрашивают, когда будет отремонтирован спортивный комплекс, я должен вызвать начальника соответствующей службы, все уточнить и быть готовым к обстоятельному ответу.

А часть вопросов мне задают экспромтом. Так вот среди вопросов, подготовленных заранее, был такой: *"Ваше отношение к досрочному голосованию? За кого вы посоветовали бы голосовать?"* Я, безусловно, не мог его обойти, потому что привык отвечать, когда спрашивают. Сказал, что не вижу ничего противозаконного в том, что у нас в стране существует досрочное голосование — это не противоречит действующему законодательству. И если у кого-то не получается проголосовать в день выборов, 19 декабря, то, конечно, нужно проголосовать раньше. А когда и за кого голосовать — каждый, естественно, решает сам. В конце добавил, что мне хотелось бы, чтобы участие в голосовании приняли все студенты БГУИР без исключения. Потому что студенты нашего вуза — это элита молодежи. И завтра именно они будут определять и строить будущее Беларуси и, возможно, будут даже управлять страной. Вот об этом я говорил.

**— Значит, голосовать за Александра Лукашенко не призывали?**

— Я сказал так: с учетом сделанного за последние годы в государстве, динамичного развития университета я советовал бы поддержать действующего главу государства, но выбор, за кого голосовать, каждый, естественно, должен сделать сам. Это был очень спокойный разговор. А то, что изложено в интернете...

**— Там написано, что вы пригрозили массовыми исключениями за неправильный выбор...**

— Это вопиющая, бессовестная ложь! И лично я порекомендовал бы должностному лицу, заявившему подобное, срочно обратиться к психиатру...

Мне столько звонков было после того, как та недостоверная информация появилась в интернете... Знакомые говорили: мол, знаем тебя как человека уравновешенного и политкорректного, а тут такое... Не скрою: у меня внутри была просто буря эмоций. Тем более столько резких отзывов на некоторых сайтах было под заметкой...

Я очень переживал. А потом мне позвонил один опытный человек и высказал такую точку зрения: а какой цели достигли люди, разместившие ту заметку в интернете? На собрании актива присутствовало около 170 человек, которые точно знают, как все происходило на самом деле и что интернетовская заметка — циничная ложь. *"Да, вы переживаете, но люди, разместившие информацию в интернете, навсегда потеряли доверие вашей студенческой молодежи",* — сказал мой собеседник.

Для меня эта позиция оказалась немного неожиданной. Но я успокоился и сегодня уже активно работаю...

Понимаете, не бывает так, чтобы из 15.700 студентов и около 3000 преподавателей и сотрудников университета все в один голос сказали: мол, у нас такой хороший, добрый и справедливый ректор. Такого просто не может быть! Я почти ежедневно принимаю решения, которые какой-то части очень нравятся, а остальным, может быть, и не совсем удобны. Я все это прекрасно понимаю. Кому-то, видимо, нужно было, чтобы информация об этой встрече появилась именно под таким соусом...

**Марина КОКТЫШ.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
26—29 ЛІСТАПАДА 2010 г.

БЕЗ РЭТУШЫ

# Выбары? Ды іх няма!

З усіх рупараў толькі і чуеш: выбары, выбары... Якія выбары? Ды іх няма, як і не было раней. І тое, што акрамя Лукашэнкі зарэгістравалі яшчэ 9 кандыдатаў — гэта зусім не паказчык дэмакратыі. Хутчэй — паказчык паказухі па сцэнарыі Адміністрацыі прэзідэнта. Ужо немагчыма было "вярхам" адмоўчвацца на патрабаванні ЕС і палітычных партый аб унясенні змен у выбарчае заканадаўства, дык кінулі костку: "міласціва" не сталі перашкаджаць збору подпісаў за вылучэнне кандыдатамі шматлікіх прэтэндэнтаў і зарэгістравалі практычна ўсіх. Глядзі, Еўропа, глядзі, Амерыка, глядзі, Расія — вось вам узор сапраўднай дэмакратыі па-лукашэнкаўску! Урэшце — і ваўкі сытыя, і козы цэлыя...

Ды не, не ўсё так гладка выходзіць, як намалявалі ўлады. У людзей жа ёсць вочы. А перад імі на тэлеэкране, па радыё (да апошняга часу, калі далі дазіраваныя выступы іншым) — адзін, толькі адзін кандыдат — А.Лукашэнка. Ён вяшчае, расхвальвае дасягненні за сваё 16-гадовае сядзенне на троне. І зноў, як у 1994-м, абяцае, абяцае, абяцае, не забываючыся прыніжаць (гэта яшчэ мякка сказана) сваіх апанентаў. Ён выступае паўсюль і ледзь не штодзённа. На яго працуюць усе дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі.

І спадарыня Ярмошына ў гэтым ніякіх парушэнняў не бачыць. Затое ўмудраецца, нават абвяшчаючы ў радыёвыступе вынікі рэгістрацыі, не назваць імёны зарэгістраваных: маўляў, ведаеце аднаго — ведайце толькі яго і далей. Астатнія ж патэнцыяльныя шукальнікі прэзідэнцкага статусу нават упамінання не варты. Затое за імі пільна сочаць і папярэджваюць аб недапушчэнні парушэнняў заканадаўства. Вось такія яны, "роўныя ўмовы" для ўсіх кандыдатаў. Усіх, акрамя аднаго.

Выбарчыя камісіі ў нашым раёне і паўсюдна сфарміраваны практычна без удзелу прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Прабачце — удакладняю: ва ўсіх камісіях ёсць прадстаўнікі ад "Белай Русі", БРСМ і дзяржаўных прафсаюзаў, а для астатніх не хапіла месца? Не знайшлося сродкаў у ЦВК і на празрыстыя скрыні для галасавання. І датэрміновае галасаванне засталося ў тым выглядзе, якое дае шырокую магчымасць для фальсіфікацый.

Дык ці ёсць шанцы ў кагонебудзь з прэтэндэнтаў перамагчы 19 снежня таго аднаго, у руках якога сканцэнтраваны магутны адміністрацыйны рэсурс?

Я кажу ўпэўнена — няма. Тым болей — лічу: сярод дзявяткі іншых прэтэндэнтаў ёсць, на жаль, і выпадковыя асобы, у якіх адсутнічае неабходны жыццёвы вопыт для таго, каб рабіць заяўку на вышэйшую пасаду ў краіне. У гэтую гульню пад назвай "прэзідэнцкія выбары" іх прывялі празмерныя асабістыя амбіцыі, няўменне мысліць катэгорыямі рэальнасці. Удзел дзеля ўдзелу наўрад ці ўздыме іх палітычную вагу. Затое паспрыяе легітымізацыі лукашэнкаўскай улады, якая на тое і робіць стаўку ў гэтай гульні.

Не, я ні ў якім разе не хачу сцвярджаць, што ў нашай краіне няма на сённяшні дзень сапраўды прыстойных, годных асоб, вартых прэтэндаваць на пасаду прэзідэнта, якія б змаглі з карысцю для народа і дзяржавы замяніць таго, хто лічыць сябе незаменным. Яны ёсць, але, валодаючы глыбокім аналітычным розумам і пачуццём адказнасці за кожны свой крок, па гэтай прычыне і застаюцца па-за гульнёй...

**Фелікс ШКІРМАНКОЎ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.**

*г.Слаўгарад.*

З ПІСЬМА

## Дзе «Вожык», і «Крокодил»

Яшчэ 5 гадоў таму я магла свабодна выказаць свае думкі пра ўсё, што хвалюе, у мясцовых газетах.

Цяпер — барані Божа!

Рэдактары баяцца ўлад.

Дык якая ж гэта свабода і дэмакратыя?

Нават пры савецкай уладзе былі папулярнымі часопісы "Вожык", "Крокодил". А ў школах — "Калючка".

Дзе ўсё гэта? Няўжо зусім не патрэбна крытыка і сатыра?

Жадаю перамен!

**Валянціна ПАЖЫЛОВА, жыхарка г.Светлагорска.**

РЕБРОМ!

## Жизнь в потемках

Скоро А.Лукашенко созывает Всебелорусское народное собрание, где заранее подобранные люди в один голос будут славить "вождя" и благодарить его за "процветание" нашей жизни. А я скажу: народным этот форум назвать нельзя, скорее — это собрание уполномоченных по типу колхозного, когда от бригад, ферм, других служб делегировались "активисты" на сход, где дружно поднимали руки за все, что скажет председатель.

Я знаю, что говорю. 40 лучших лет своей жизни отдал сельскому хозяйству: начинал с бригадира, 16 лет председательствовал в колхозе. Ничего, кроме болезней, за это время не нажил. Но и сейчас, став инвалидом-пенсионером, не теряю интереса к тому, что происходит вокруг, как живут люди в деревнях нашего района.

Возьму только Заречье, где сам живу. Что мы здесь видим? Наступили холода, а более ста семей не имеют воды. Их коллективное письмо к руководству Смолевичского райисполкома ничего не изменило, его председатель А.Рулькевич никаких мер не принял. Более того, по его указанию было отключено все уличное освещение, и люди вынуждены пробираться в темноте, как призраки, в том числе и родители с малышами-детсадовцами. Хороши стандарты цивилизации в районе! Ведь наша деревня — не единственная, где они установлены.

Кстати, о самых маленьких сельчанах. Когда-то в Заречье было детское кафе, оно пользовалось популярностью у населения. Теперь там, вблизи детского сада, — ресторан, клиенты которого не всегда подают пример достойного поведения детям. А их у нас около полутораста...

У взрослых же проблем выше головы. Медицинских, например. Попробуй-ка поправить зрение, если во всем районе нет офтальмолога, а у большинства стариков беда с глазами. Или такая проблема, касающаяся буквально всех: у нас нет общества защиты прав потребителя, а что это значит, сами знаете.

Колет глаза и то, как некоторые руководители используют служебный транспорт в личных целях. В частности, директор Смолевичской бройлерной фабрики гоняет машину из Минска, где живет, и назад за 70 километров. Посчитайте, в какую копеечку это влетает госказне, которую наполняет народ своим трудом? А тем временем у инвалида I группы, ветерана этой птицефабрики Г.Хурсевич отключили в сарайчике свет, и она, вдобавок ко всему, сломала руку... А это уже — стандарт агрогородка, коим является поселок Октябрьский той же птицефабрики.

Из подобных "мелочей", на которые не обращает внимания местное начальство, и складывается наша жизнь. И вряд ли эти житейские "мелочи" окажутся в поле зрения Всебелорусского народного собрания, куда делегирован и наш председатель исполкома А.Рулькевич. Не хочу ничего плохого сказать о других делегатах — верю, среди них есть отличные труженики и управленцы. Но вот наш "посланец"-назначенец выглядит в глазах многих жителей района не лучшим образом.

Боюсь, что и лучшие на том собрании будут покорно поднимать руки за "высочайшие" решения, где, конечно же, все будет красиво и радостно, но не все будет стыковаться с нашей реальностью, нередко похожей на потемки.

**Геннадий ШУКАН, ветеран труда.**

*д.Заречье Смолевичского района.*

ПАЗІЦЫЯ

## 19 снежня я пацісну руку Саннікаву

Мая маладосць прайшла ў часы татальнага дэфіцыту. У 1979 годзе — за год да абяцанага канчатковага будаўніцтва камунізму — дэфіцытам было ўсё. У прадуктовых крамах — пустыя паліцы, а ўсё неабходнае, пачынаючы ад туалетнай паперы да ботаў, даставалася па блату. Для таго каб зрабіць провады ў армію, трэба было ехаць за прадуктамі ў Друскінінкай (Літва). Дарэчы, тыдзень таму мне пашчасціла зноў пабываць у Друскеніках, у аквапарку. Гэта неба і зямля ў параўнанні з Гродзенскім лядовым палацам.

І ўсё ж і ў Беларусі сёння застаўся толькі адзін дэфіцыт — дэфіцыт інфармацыі. Хоць мы і слухаем радыё, глядзім тэлевізар, чытаем газеты, але атрымаць інфармацыю — праўдзівую (!) — немагчыма.

Праўдзівая — гэта такая, якая адлюстроўвае стан і настрой людзей. Якую я бачу паўсюль: на працы, у транспарце, на вуліцах кожны дзень.

Жыву я недалёка ад польскай мяжы. І калі гляджу польскія навіны, адразу заўважаю кантраст. На кожную падзею ў іх даецца некалькі ацэнак, часта процілеглых, супярэчлівых. А што ў нас?

Інтэрнэтам я не ўмею, на жаль, карыстацца, таму адзінай крыніцай інфармацыі для мяне з'яўляецца газета "Народная Воля". З артыкуламі, надрукаванымі ў ёй, я магу пагаджацца ці не, але толькі тут прадстаўлены розныя думкі.

А цяпер успомнім, што менш за месяц засталося да выбараў прэзідэнта — выбараў без выбару. Не трэба быць Настрадамусам, празарліўцам, каб ужо сёння прадставіць сабе, як яны пройдуць.

Нехта з мудрацоў сказаў: "Як ты ні рабі, а будзе так, як быць павінна". 19 снежня ў Беларусі ўсе будзе рабіцца так, як не павінна рабіцца. На нашым выбарчым участку (у вёсцы ж нельга ўтрымаць таямніц) ужо даведзена лічба галасоў, якая будзе пададзена ў Цэнтрвыбаркам па кожным кандыдаце. Не сумняваюся, што ўсе сілавыя структуры ўжо зараз прыводзяцца ў стан павышанай гатоўнасці, каб абараніць гэтыя прапісаныя і прыдуманыя ў высокіх кабінетах лічбы.

Хутчэй за ўсё нічога мы не зменім, і адбудзецца так, як запланавана зверху. Але ўсё гэта толькі таму, што ў Мінску 19 снежня збярэцца разам столькі людзей, колькі павінна сабрацца ў Гродне, Баранавічах, Маладзечне і астатніх буйных гарадах, але значна меншых за сталіцу. Для мяне зразумела, што толькі калі людзі будуць актыўна пратэставаць супраць падману, калі іх збярэцца не адна сотня тысяч — тады ні адзін афіцэр не аддасць загад жорстка збіваць сваіх суайчыннікаў.

Шкада, вельмі шкада, што сёння мы губляем шанс змяніць наша жыццё. Я чытаў артыкулы Саннікава, Някляева, Раманчука, Пазьняка... Усё правільна. Але без рэальнай падтрымкі людзей самі яны са сваімі камандамі проста не здолеюць нешта зрабіць.

Няважна хто — Някляеў, Саннікаў ці Раманчук — набярэ больш галасоў. (На мой погляд, будзе ў іх недзе аднолькава.) І я лічу, што толькі разам, утрох, яны могуць перамагчы, могуць вывесці краіну з крызісу.

Упэўнены, што калі яны аб'ядноюцца, спадарыні Ярмошынай будзе значна цяжэй агучыць зараней падрыхтаваныя лічбы.

Я падпісваўся за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты Андрэя Саннікава і буду за яго галасаваць. 16 гадоў таму галасаваў за Пазьняка, але сёння з ім не пагаджаюся. 19 снежня я маю цвёрды намер быць у Мінску і пацісную руку свайму кандыдату.

**Пётр СКРАМБЛЕВІЧ, вёска Каробчыцы Гродзенскага раёна.**

ПЫТАННЕ—АДКАЗ

## Кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў — палітычны аглядальнік «Народнай Волі»

**Кандыдатам на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зарэгістраваны Андрэй Алегавіч Саннікаў, палітычныя каментары якога з'явіліся апошнім часам на старонках "Народнай Волі".**

**Скажыце, калі ласка, ён уладкаваўся на работу ў рэдакцыю газеты "Народная Воля" толькі напярэдадні выбараў ці значна раней? Магчыма, выконваў іншыя абавязкі, а палітычным аглядальнікам стаў нядаўна...**

**Сяргей КАРАЛЬЧУК, выбаршчык.**

Паважары спадар Каральчук!

Андрэй Алегавіч Саннікаў, якога днямі Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала адным з кандыдатаў у прэзідэнты, напісаў заяву з просьбай залічыць яго ў штат рэдакцыі газеты "Народная Воля" 20 верасня 2010 года. Менавіта з гэтага дня ён з'яўляецца палітычным аглядальнікам выдання. З некаторымі яго каментарыямі Вы ўжо змаглі пазнаёміцца. Паколькі А.Саннікаў — прафесійны дыпламат, то, спадзяёмся, яго нататкі знойдуць водгук у шырокай чытацкай аўдыторыі.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

## Тогда этот форум был бы мини-референдумом

Уважаемый господин Президент!

В газетах и по телевидению много говорится о проведении 6—7 декабря очередного Всебелорусского народного собрания. К сожалению, на нем соберутся лишь те люди, которых коллективы отобрали с разрешения Ваших администраций. Таким образом, там не будут представлены взгляды и мнения всего народа.

Если Вы действительно хотели, чтобы эта встреча была с представителями всего народа, то это нужно было сделать так, как это делается при исследовании общественного мнения. Делается так называемая случайная выборка двух тысяч человек, задаются им конкретные вопросы, чтобы они ответили. Ошибок будет не более 2—3 процентов.

Для создания такой случайной выборки, представляющей всех граждан страны, стоило бы выбрать три четырехзначных номера, например, 2398, 3765 и 6732. У кого номера паспортов заканчиваются на эти числа, будут приглашены на встречу с Вами во Дворец Республики.

Тогда этот форум рассматривался бы как мини-референдум, и с его резолюциями считались бы все граждане Беларуси и государства мира как с настоящим мнением народа.

С уважением —

**Александр "Граф" Прушинский.**

Минск.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

## Зенон Пазьняк был прав

В свое время З.Пазьняк говорил, что обеспечение Беларуси только российскими нефтью и газом не позволит нашей стране иметь экономическую независимость от России. Он предвидел, что решение этой задачи в большей степени зависит от наличия нефтепроводов, связывающих черноморские порты с балтийскими, проходящими через территорию Беларуси. За это он подвергался жесткой критике, гонениям, оскорблениям, обвинялся в разжигании конфликта с Россией и, в конце концов, был изгнан из страны.

Пришло время, подтвердившее правоту З.Пазьняка. Заокеанская нефть из черноморских и балтийских портов перевозится железнодорожным транспортом, во что это обходится, понятно всякому.

Нынешнему руководству надо иметь мужество признать свои ошибки, которые дорого обходятся нашей стране, и извиниться перед З.Пазьняком за свою недальновидность.

**Александр Эдуардович ВАРАКСА, пенсионер.**

*Минск.*

З НАТУРЫ

## Кукіш у кішэні

Лукашэнкаўскія ідэолагі з раніцы да вечара трубяць нам пра павышэнне заробкаў, пенсій, стыпендый і іншых выплат. Але які сэнс ад гэтых павышэнняў, калі яны амаль адразу "з'ядаюцца" ростам цэн і павышэннем тарыфаў. Ды і як еўрапейская краіна можа ганарыцца сярэдняй пенсіяй крыху большай за 600 тысяч рублёў? На гэтыя грошы нельга ПРАЖЫЦЬ, на іх можна ПРАІСНАВАЦЬ, не памерці з голаду, перабіваючыся з чорнага хлеба на абястлушчаны кефір і гародніну.

Дзе ж пры такім раскладзе нашым пенсіянерам марыць пра турыстычныя вояжы не тое што ў Еўропу, а нават у Расію ці Украіну?! Ім часам не хапае грошай, каб дабрацца да абласнога шпіталя на абследаванне.

А пра абяцаныя міфічныя заробкі ў 500 долараў у правінцыі і не чулі. Большасць працаўнікоў атрымлівае па 500—600 тысяч рублёў, і каб не пакласці зубы на паліцу, абрабляе свае "соткі" і пры гэтым зацята маўчыць, трымаючы, як заўсёды, кукіш у кішэні.

**Дзяніс РАБЯНОК, грамадскі актывіст з Калінкавічаў.**

АКТУАЛЬНО

# Ученые еще не определили, как повлияла чернобыльская трагедия на здоровье белорусов

*В эти дни в Минске проходит научно-практическая конференция "Экология человека в постчернобыльский период". Медики, экологи, педагоги обсуждают, что сделано в стране по преодолению последствий чернобыльской катастрофы и на что следует обратить внимание.*

*Но уже первые выступления, которые прозвучали с трибуны, настораживают: учеными не найдены ответы на многие вопросы, главный из которых — как сказалось и будет сказываться в дальнейшем радиационное облучение на здоровье белорусов, потому что от радиации мы не избавились до сих пор.*

— Японские медики доказали, что через 40 лет после бомбардировки Хиросимы и Нагасаки наблюдался пик заболеваемости злокачественными опухолями, — заявил бывший директор Института радиационной медицины, профессор **Алексей Океанов**. — Но там было однократное облучение. Чернобыльская трагедия — это облучение пролонгированное, длительное, оно в небольших дозах постоянно воздействует на организм человека. Таким образом, какими будут последствия этой катастрофы, мы не знаем. А интерес к проблеме, к сожалению, потихонечку ослабевает.

Профессор Алексей Океанов констатирует: выводам о воздействии радиации, которыми располагают белорусские ученые сегодня, нельзя доверять безоговорочно.

— Во-первых, основополагающая система для правильных оценок и правильных выводов — это организация сбора и верификация данных. К сожалению, у нас эта верификация данных основывается в основном на статистике, — говорит ученый. — А статистика не является самым лучшим показателем для изучения. Например, кто знает сегодня, какие дозы получило население и те люди, которые работали на ликвидации аварии? Ведь всем известно, что очень часто один дозиметр использовался на всю группу, что скрывались данные о тех дозах, которые превышали допустимые нормы. Информацию о дозах нельзя назвать достоверной.

Кроме того, подчеркивает Алексей Океанов, "самый печальный и главный фактор, который мешает нам разобраться в ситуации воздействия малых доз радиации на организм человека, — латентный период заболеваний".

— Он очень длительный для развития, в первую очередь, злокачественных новообразований, — подчеркивает ученый. — За исключением лейкозов и рака щитовидной железы, он составляет 20 и более лет. А знаменитый доклад, подготовленный под эгидой МАГАТЭ, из которого следует, что Чернобыль практически не повлиял на здоровье людей, а если и повлиял, то незначительно, был сделан через 17 лет после трагедии, когда эти эффекты не были проявлены в полной мере.

Сегодня в перечень заболеваний, которые белорусский Минздрав соотносит с возможным воздействием чернобыльской катастрофы, включено 19 пунктов.

— В основном это злокачественные новообразования, включая лейкозы, лучевую катаракту, и больше ничего практически мы не видим, — отмечает Алексей Океанов. — Тем не менее многочисленные исследования наших врачей и международных экспертов показывают, что есть ряд других заболеваний, которые могут быть связаны с радиационным облучением, в том числе гипертоническая болезнь, сердечно—сосудистые патологии, сахарный диабет, узловой зоб.

Кроме того, напоминает ученый, в Беларуси не учитывается медицинское облучение. А ведь оно дополняет чернобыльское.

— Если за счет естественного фона белорусы получают дозу 1 мзв/год, за счет родона — 2 мзв/год, то за счет медицинского облучения — 1,4 мзв/год, — подчеркивает Алексей Океанов. — Следовательно, есть группы людей, которые получают за счет медицинских источников большие дозы облучения. При профилактических медицинских мероприятиях доза, как записано в инструкции, не должна превышать 1 милизиверта, ее можно превысить только в случае эпидемий по спецраспоряжению Минздрава. Однако на практике это не всегда соблюдается.

И наконец, убежден ученый, необходимо учитывать не только внешнее облучение, но и внутреннее, которое получают люди при потреблении зараженных радионуклидами продуктов.

— Из Национального доклада распределения радионуклидов в почве следует, что если в первые годы после аварии залегание цезия и стронция в почве составляло всего несколько сантиметров, то через 20 лет их уровень уже составил более 31—35 сантиметров, — подчеркивает Алексей Океанов. — И все наши программы по реабилитации территории привели к тому, что мы поднимаем радионуклиды вверх.

— Сегодня перед нами стоит огромное количество вопросов, — делает вывод Алексей Океанов.

Стоит напомнить, что в результате чернобыльской катастрофы в атмосферу было выброшено в 300 раз больше радиоактивных веществ, чем во время бомбардировки Хиросимы. Более 70% этих веществ осели на территории Беларуси. Радиацией заражено примерно 25% от общей площади сельхозугодий и лесов нашей страны.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

# Фікусы і пальмы засланяюць істотнае

**Дзяржаўныя СМІ актыўна паведамляюць пра тое, што зараз паўсюдна праходзяць трэнінгі для членаў выбарчых камісій, на якіх адпрацоўваецца, як яны павінны паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі. Ці сапраўды ЦВК даў загад на нейкую сур'ёзную дэмакратызацыю выбарчага працэсу?**

**Мая Чарнавус, г.Мінск.**

Эксперт кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" Валянцін Стэфановіч, прааналізаваўшы тэкст пастановы Цэнтральнай камісіі "Аб правядзенні трэнінгу для сябраў участковых камісій па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2010 годзе", якой зацверджаны прыкладны сцэнарый трэнінгу, аптымізму не выказвае.

— Некаторыя сітуацыі, прапісаныя ў сцэнарыі трэнінгу, з'яўляюцца адказам на прапановы і заўвагі ЦВК з боку незалежных назіральнікаў і палітычных суб'ектаў, — адзначае праваабаронца. — Напрыклад, на апошнія прапановы ЦВК ад кампаніі "За справядлівыя выбары" — наконт магчымасці распісацца назіральніку на паперцы, якой заклеена шчыліна ў скрыні для датэрміновага галасавання, а таксама аб магчымасці прысутнічаць на ўчастку ўначы — адказам з'яўляецца пазначаная ў пастанове "Сітуацыя 5". "Як павінен адрэагаваць на такія прапановы старшыня камісіі?" — ставіцца пытанне перад сябрамі УВК. І тут жа падаецца "правільны адказ", што, "подпісы на паперцы ставяць старшыня ці намеснік старшыні і сябра камісіі", а "ахова памяшкання для галасавання... ускладаецца на супрацоўніка міліцыі".

Аднак некаторыя "правільныя адказы" скіраваныя на задавальненне намераў і просьбаў назіральнікаў. Яскравы прыклад — опус ЦВК "пра фікусы і пальмы", выкладзены ў "Сітуацыі 6". Не палянуемся працытаваць: "Камісія намагалася стварыць святочную абстаноўку ў памяшканні для галасавання, яскрава і маляўніча аформіла інфармацыйны стэнд, скрыні для галасавання, падабрала прыгожую мэблю, упрыгожыла інтэр'ер фікусамі і пакаёвымі пальмамі. Назіральнік папрасіў старшыню адсунуць фікусы і пальмы ўбок, паколькі яны перашкаджаюць яму назіраць за працэсам галасавання, засланяюць скрыню для галасавання".

— Вельмі важная задача для ўчастковых камісій ставіцца ў "Сітуацыі 6", — іранічна заўважае Валянцін Стэфановіч. — Мы заўсёды казалі пра тое, што назіральнікаў на выбарчых участках адсаджваюць вельмі далёка ад сталоў, і яны сядзяць за фікусамі і пальмамі. Таму, я так разумею, Цэнтральная камісія вырашыла гэты недахоп выправіць.

Ужо без іроніі праваабаронца выказвае занепакоенасць тым, што ў частцы пра падлік галасоў і ўстанаўленне вынікаў галасавання ЦВК ніякім чынам не прапісала спосаб падліку галасоў.

— Хаця Лідзія Ярмошына неаднаразова казала, што кожная камісія сама вырашае, якім чынам яна будзе праводзіць падлік галасоў, мы тут бачым, што камісіям не прапаноўваецца вызначыць гэты спосаб, г.зн. правесці пасяджэнне, вырашыць, якім чынам яны гэта будуць рабіць. Проста напісана, што старшыня камісіі абвяшчае пра заканчэнне галасавання і камісія прыступае да падліку галасоў. Як яна гэта будзе рабіць — не сказана. І мне не зразумела, як сябры ўчастковых выбаркамаў будуць лічыць галасы. Калі як заўсёды — супольна і адначасова кожны свой стос — то мы зноў, на жаль, не зможам убачыць працэдуры падліку галасоў, — перасцерагае Валянцін Стэфановіч.

Праваабаронцы шматразова заяўлялі пра вельмі істотны недахоп выбарчага заканадаўства — працэдура падліку галасоў не прапісана ні ў Метадычных рэкамендацыях, ні ў пастановах ЦВК, ні ў Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь.

ХОЧУ СКАЗАТЬ!

## Почему я не пойду голосовать

О реформировании избирательного законодательства вроде бы сказано немало. Но воз и ныне там: за 16 лет никаких реформ. Главный избирательный документ — бюллетень — является фактически легко подделываемой бумажкой без дубликата, без учетного порядкового номера, который легко может себе оставить избиратель. Вот и возникает у меня вопрос: как можно избирателю контролировать учет своего голоса? Сколько напечатано бюллетеней, сколько испорчено, сколько осталось неиспользованными? Учетных номеров, дубликатов нет, а значит, нет и возможности контроля. А где отсутствует контроль и учет —-присутствует обман. Поэтому для себя я решил: отказываться от участия в выборах до тех пор, пока не изменится избирательная система.

**Ю.ГОЛОВНЕВ.**

*г.Мозырь.*

Народная Воля
http://www.nv-online.info
26—29 ЛІСТАПАДА 2010 г.

### *Уладзімір КАРАТКЕВІЧ:*

# *«Не для сябе, а для маёй роднай краіны, для Беларусі»*

*Такім бачыў сэнс свайго жыцця і творчасці пісьменнік, які стаўся легендай і класікам яшчэ пры жыцці.*

*Сёння Уладзіміру Сямёнавічу Караткевічу было б 80 год. Ён пакінуў гэтую зямлю, якую так любіў і за якую хварэў сэрцам, 26 год таму, а яшчэ і сёння мог бы быць сярод нас...*

*Ён і ёсць! Быў, ёсць і будзе. Каб пераканацца ў тым, варта толькі ўзяць у рукі любую яго кніжку, любы твор: не адарвацца! І хай сабе чарадзей прыгожага беларускага пісьменства не меў афіцыйнага ганаровага звання, у вачах і душы народа ён быў і застаецца сапраўды народным, блізкім сваёй усёпаглынальнай любоўю да Радзімы, захапленнем яе гераічнай гісторыяй, цудоўнымі людзьмі, непаўторнай прыгажосцю.*

*Уладзімір Сямёнавіч, усведамляючы сваё прызначэнне, быў тым не менш надзвычай сціплым чалавекам. Мужна сустракаў стрэлы зайздроснікаў і нядобразычліўцаў, іранічна-ўсмешліва ставіўся да слоў ухвалы, пераводзіў іх на жарт. Ніякіх катурнаў, ганарыстасці, пыхлівай велічы іншых "геніяў". Ён быў геніем сапраўдным — геніем Свабоды і Дабра.*

*Постаць Уладзіміра Караткевіча годна і прыгожа высіцца ў шэрагу найвыдатных, найлепшых сыноў Бацькаўшчыны, якія спаўна спраўдзілі свой доўг перад ёю.*

*Слова — самому Караткевічу.*

*Пачытаем, паразмаўляем з ім, наталімся і прычасцімся ...*

*Уладзімір КАРАТКЕВІЧ*

## *(З ЖЫЦЦЯПІСУ)*

# Дарога, якую прайшоў

Я ўраджэнец той часткі Беларусі, якая ляжыць на Дняпры. Люблю беларускае Палессе, і казачна мяккую Навагрудчыну, і адзіную ў свеце Белавежу, і суровую прыгажосць паўночнага азёрнага краю. Іх нельга аддзяліць ад мяне, але ў Прыдняпроўі мне неяк больш прытульна.

На Украіне берагі Дняпра нагія, а тут яны ўсе ў лясах, курганах, у вёсках на ўзгорках, у садах, у забытых гарадзішчах, густа ўкрытых шыпшынаю і чортапалохам, у запушчаных парках.

Калі раніцаю плывеш на чаўне праз рачны туман і бачыш след за галавою выдры, што пераплывае раку, або ўсплёск бабра — адчуванне шчасця, адзінства з гэтай зямлёй і любоў да яе перапаўняюць цябе.

Продкі мае таксама ўсе адсюль. Гісторыю маю можна было б пачаць з таго, што роўна сто год таму назад мая зямля была ахоплена паўстаннем. Гарэла ўсё: фальваркі, вёскі, цэрквы, нівы. Адна бітва адбылася на поўнач ад Рагачова. Паўстанцаў разбілі, камандзіра іхняга расстралялі ў Рагачове. Ён быў мне сваяк з боку маці і яе радні. І такіх было многа. Гэтую ж гісторыю я апісаў у пралогу да рамана "Леаніды не вернуцца да Зямлі".

Трэба было неяк жыць астатнім на спустошанай, выпаленай зямлі. І жыццё пачалося цяжкае. Пачалося збядненне, часамі настолькі вялікае, што ў асірацелых (а часам і не ў асірацелых) дзяцей не было чаго есці.

Дзед, бацька маёй маці (ён памёр у вайну), даслужыўся да павятовага казначэя і прытым быў атэіст і спачуваў марксістам, — магчыма, не столькі разбіраючыся ў гэтым, колькі ў памяць аб сямейнай трагедыі. У доме ў яго, калі верыць сямейнаму паданню, знаходзіў прыстанак П.Лепяшынскі.

Быў гэта чалавек уладны, разумны і з'едлівы. Ён цудоўна бачыў дурасць і ўмеў пусціць яе голай. Валодаў нязмернай духоўнай і фізічнай сілай, бязмежнай энергіяй і азартам. Калі ён, незадоўга да смерці, аслеп — я быў у яго чымсьці накшталт сакратара: чытаў яму, а часам і пісаў за яго. Таму што "непісьменным" сябе не памятаю. Маці кажа, што чытаць, непрыкметна для іншых, навучыўся ў тры з паловаю гады, а пісаць трохі пазней. І, здаецца, гэта быў першы і апошні мой подзвіг.

Маці мая, Надзея Васільеўна, нарадзілася ў 1893 годзе, у дзяцінстве засталася без маці, скончыла Марыінскую гімназію ў Магілёве, некаторы час, кінуўшы дом, працавала вясковай настаўніцай у вёсцы Збароў, ля Рагачова, а пасля пазнаёмілася з маім бацькам, Караткевічам Сямёнам Цімафеевічам, і ў 1917 годзе выйшла за яго замуж (бацька нарадзіўся ў 1887 годзе, памёр у 1959-м).

У сям'і нас было трох. Старэйшы брат (загінуў на апошняй, спадзяюся, што апошняй, вайне), старэйшая сястра і я.

Я нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Тады гэта быў маленькі гарадок. Зялёныя вуліцы, рэшткі валоў замчышча, гудкі далёкіх цягнікоў і блізкіх параходаў (чыгунка і аўтобусы яшчэ не забілі раку), дубовыя лясы на берагах і ліпы на вуліцах, недалёкія парогі. І, вядома, сотні крыніц па берагах і нашы песні. І перш за ўсё кнігі. Кніг у доме было мноства: і рэшткі дзедавай бібліятэкі, і кнігі бацькоў, і свае.

Пісаць (а спачатку "бубніць") вершы пачаў год у шэсць, але, на шчасце, хутка кінуў гэты занятак. Трохі пазней спрабаваў пісаць апавяданні, прычым абавязкова іх ілюстраваў. Увогуле, усё гэта было разнавіднасцю дзіцячай гульні. Таленты выявіў разнастайныя: і маляваў, і ў музычную школу хадзіў (прычым абсалютны слых спалучаўся ўва мне з гэткай жа абсалютнай лянотай), але ўсе гэтыя таленты пайшлі тунна.

А потым пачалася вайна. Бамбёжкі. Эшалоны. Пачуццё бездапаможнасці падлетка, які ўжо не дзіця, што спакойна пакладаецца на старэйшых, але яшчэ і не мужчына, каб так ці інакш дзейнічаць і, магчыма, вырашаць свой лёс. Бунтаваў супраць гэтага пачуцця. Некалькі разоў уцякаў з інтэрната на фронт. Затрымлівалі, вядома. А з інтэрната таму, што здарылася звычайная на вайне рэч: доўгі час не ведаў, дзе бацькі і ці жывыя яны наогул, а калі жывыя, то дзе, за лініяй фронту або паспелі эвакуіравацца.

Быў спачатку ў Маскве, потым на Разаншчыне. Пасля давялося ўцякаць і адтуль. На Урал, у наваколле Кунгура. Выпадкова даведаўся, што бацькі ў Арэнбургу. З вялікімі цяжкасцямі (без пропуска і білета) дабраўся да іх. У Арэнбургу скончыў шосты клас. Потым нядаўна вызвалены Кіеў (Беларусь яшчэ была акупіраваная).

Крашчацік ляжаў у руінах. Па бульвары Шаўчэнкі некалькі разоў на суткі праходзіў трамвай. У руінах універсітэта мы разважаліся, шукаючы міны. Як не трапіў у "палату мінёраў" (па выразу майго друга паэта Р.Барадуліна), сам не ведаю.

А горад, нягледзячы на запусценне, быў прыгожы. Такія залатыя каштаны на вуліцах, такія пустыя здзічэлыя паркі!

Восенню сорак чацвёртага пераехалі на Беларусь. І вось тут упершыню ўбачыў сапраўдны разор, "зону пустыні", некалькі ўскраінных завулкаў, як канцы галінак на згаслага вогнішча. Гарады, дзе нават руінаў не было. (Немцы разабралі іх на цэглу для абаронных патрэб.) Да голаду і холаду было не звыкаць, але тут, на выпаленай зямлі, так намерзліся, што часам хацелася памерці, абы толькі цябе пакавалі ў печы.

Але ад работы не бегаў. І сябры-аднакласнікі былі такія самыя. Надзіва згуртаваны, вясёлы і сумленны народ. І не змяніліся за дзевятнаццаць год. Мы, вядома, агрубелі. І ўсё ж многіх з нас цягнула да вершаў. Столькіх, што мы нават выдалі некалькі нумароў рукапіснага часопіса "Званочак".

Чамусьці вершы былі патрэбней за многае. А пісаліся ж пры святле гільзы на нямецкіх бланках ці на звароце доўгіх жоўтых канвертаў, таксама нямецкіх. Аддавалі перавагу канвертам, з-за добрай паперы. Большасць вершаў, якія тады друкаваліся, мы не любілі: такая ў іх была бесшабашнасць. А былі яшчэ вершы саладжавыя.

А добрыя вершы любілі вельмі. З беларускіх, напрыклад, вершы Пімена Панчанкі, некаторыя вершы Танка часоў вайны і ўсе, амаль без выключэння, ягоныя даваенныя вершы.

Напісаў я тады, думаю, не менш за дзвесце вершаў, але нікому іх не паказваў. А потым прыйшла настаўніца, якую заўсёды памятаю дабром, — Е.І.Грыневіч. І неяк так атрымалася, што ёй некаторыя вершы паказаў. Яны і прыгодніцкая аповесць "Загадка Неферціці" былі "надрукаваны" ў нашым "Званочку". І гэта была адзіная мая "публікацыя" за дзесяць год. Цяпер усё гэта недзе згубілася, і шкадаваць аб ім пэўна няма чаго.

У сорак дзевятым годзе я паступіў у Кіеўскі універсітэт на філалагічны факультэт. Вучыўся, быў шчаслівы, меў шмат сяброў і ўсё ж успамінаю гэты час са змешаным пачуццём глыбокай пяшчоты і сораму. Пяшчоты — таму, што была навука, старыя рукапісы, кнігі, музеі, музыка, дзяўчаты, сябры, свае і чужыя вершы. Сораму — таму, што нярэдка даводзілася тады сустракацца са звычайнай вульгарызацыяй навукі.

Мне хацелася самому зразумець, чаму і нашто, і таму на некаторыя лекцыі я не хадзіў, а замест таго сядзеў у публічнай бібліятэцы.

Як ні дзіўна, я не хацеў быць літаратарам. Вершы пісаў для сябе. А ў будучым хацеў быць літаратуразнаўцам. Напісаў некалькі прац: "Багдановіч і сучаснасць", "Моўная стыхія Пушкіна", "Цёмныя месцы "Слова", "Беларускія і ўкраінскія школьныя драмы", "Авакум і літаратура расколу", "Справа пра "Саборныя дзеянні" (гісторыя палітычнай падробкі і яе выкрыцця, як "кнігі ў паўдзесць, старажытным беларускім характарам пісанай").

Пасля заканчэння універсітэта я здаў кандыдацкі мінімум і пачаў быў пісаць дысертацыю пра паўстанне 1863 г. ва ўсходнеславянскіх і польскай літаратурах, але прыйшлі іншыя інтарэсы: з'явілася задумка аб рамане на тую самую тэму. Да рэалізацыі яе, праўда, я прыступіў толькі праз дванаццаць год. Над гэтым раманам — "Каласы пад сярпом тваім" — працую і зараз.

А тады я проста сабраўся і паехаў настаўнікам у глухую вёску Лесавічы, што ля Тарашчы. Працаваў там два гады. І, нягледзячы на ўсё, удзячны і вёсцы і універсітэту. Удзячны многім сумленным хлопцам, кнігам, пошукам. Удзячны настаўнікам і старэйшым сябрам: А.А.Назарэўскаму, А.І.Бялецкаму, Л.А.Панамарэнка, С.І.Маславу. Іх я любіў, і яны мяне любілі. Хто жывы — тым сто год жыцця. Хто памёр — пухам ім зямля.

